86
313

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

Установа адукацыі
"Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт
імя Максіма Танка"

УДК 282(476) "1980/2000"

ЗАВАЛЬНЮК
Уладзіслаў Мацвеевіч

# Адраджэнне і дзейнасць рымска-каталіцкай канфесіі ў Беларусі (сярэдзіна 1980-х – 2000 гг.)

07.00.02 – айчынная гісторыя

АЎТАРЭФЕРАТ
дысертацыі на суісканне вучонай ступені
кандыдата гістарычных навук

Навукова-бібліяграфічны аддзел

Мінск, 2002

Установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт ... БІБЛІЯТЭКА"

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

86.29(4 бен)
З-13

Работа выканана ва Установе адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка"


Навуковы кіраўнік: доктар гістарычных навук, прафесар Уладзімір Іосіфавіч Навіцкі, Інстытут гісторыі НАН Беларусі

Афіцыйныя апаненты: доктар гістарычных навук Вольга Юр'еўна Васільева, Інстытут расійскай гісторыі РАН (г. Масква)

кандыдат культуралогіі Іван Іванавіч Трацяк, Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы.


Апаніг ... ыска Скарыны

Абарона адбудзецца 28 чэрвеня 2002 г. у 15.00. на паседжанні Савета па абароне дысертацый Д 02.21.03 пры Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка па адрасу: 220050, г. Мінск, вул. Савецкая, 18, ауд. 482.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў чытальнай зале бібліятэкі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка

Аўтарэферат разасланы 27 мая 2002 г.

Вучоны сакратар
Савета па абароне дысертацый І. І. Багдановіч

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

***Актуальнасць тэмы дысертацыі.*** Станаўленне грамадзянскай супольнасці ў Беларусі немагчыма без стварэння ўмоў для рэлігійнага плюралізму, цярпімасці, свабоды сумлення. Сіла грамадства не ў падзеле людзей па рэлігійных прыкметах, а ў стварэнні ўмоў, накіраваных на ўзмацненне маральнасці – генетычнага коду культуры, усталявання духоўнай прасторы, згуртаванасці людзей. Дыялог, талерантнасць – не адмова ад уласных перакананняў чалавека альбо сацыяльнай групы людзей. Гэта шлях да дэмакратыі, паразумення, гуманізму. Ажыццяўленне ўсебаковай духоўнай свабоды ў жыцці, стварэнне цывілізаваных адносін царквы і дзяржавы немагчыма там, дзе парушаюцца правы чалавека, дзе значныя перавагі надаюцца атэізму, альбо якой небудзь адной рэлігіі, што не гарантуе развіццю іншадумства і рэлігійнага плюралізма.

Здаўна беларуская зямля з'яўляецца поліканфесійнай. Гэта традыцыя ўмацоўваецца ў апошнія гады. Калі ў 1985 г. у рэспубліцы налічвалася 8 канфесій, то па дадзеных Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь на 1 студзеня 2002 г. іх колькасць дасягнула 26. Гэта натуральны працэс. Шматнацыянальная дзяржава не можа пайсці па шляху рэалізацыі пачуццяў вернікаў адной нацыянальнасці, шляхам прыдання ёй статусу дзяржаўнай. Гэта ўступае ў супярэчанне з прынцыпамі дэмакратыі, свабоды веравызнання.

Другое месца па колькасці вернікаў сярод канфесій Беларусі належыць Рымска-Каталіцкаму Касцёлу. Спецыфіка яго дзейнасці заключаецца ў незалежнасці ад палітычных, ідэалагічных і іншых інтарэсаў, якія вынікаюць са своеасаблівай незалежнасці цэнтра Касцёла – дзяржавы Ватыкан, якім кіруе Папа Рымскі. Рымска-Каталіцкая канфесія адыграла важную ролю ў працэсе фарміравання беларускай культурнай традыцыі. З'яўляючыся адной з галін хрысціянства, на працягу стагоддзяў яна рабіла ўплыў на значную частку насельніцтва, садзейнічала фарміраванню агульначалавечага светаўспрымання і светапогляду. Каталіцызм прадстаўляе сабой частку сусветнай цывілізацыі, яе духоўна-рэлігійны і сацыяльна-культурны кампанент. Каталіцкая думка ўвайшла ў лік важнейшых светапоглядных напрамкаў, якія валодаюць розумам многіх людзей. Яе актывізацыі садзейнічала падрыхтоўка і святкаванне РКК 2000-годдзя нараджэння Езуса Хрыста.

Даследаванне з'яўляецца адказам на ўсплеск цікавасці апошняга дзесяцігоддзя айчыннай навукі да рэлігійнай праблематыкі. Робіцца спроба зняць з Рымска-Каталіцкага Касцёла абвінавачванні ў рэакцыйнасці і антынародным характары, асэнсаваць роль і месца Каталіцкага-Касцёла як рэлігійнага, грамадска-духоўнага і этнакультурнага феномена ва ўмовах поліканфесійнай і культурнай разнастайнасці Беларусі.

***Мэты і задачы даследавання.*** Мэта дысертацыі – правесці навуковы аналіз дзейнасці Рымска Каталіцкага Касцёла ў Беларусі з сярэдзіны 80-х гадоў XX ст. да 2000 года. Яна рэалізуецца праз рашэнне наступных задач:

– вывучыць становішча Рымска-Каталіцкай канфесіі ў Беларусі да сярэдзіны 80-х гадоў XX ст., якая апынулася ў эпіцэнтры шматгадовай ідэалагічнай барацьбы, што разгарнулася паміж Масквой і Ватыканам;

– выявіць фактары, якія насуперак масіраванай атэістычнай прапагандзе стваралі ўмовы да адраджэння каталіцкай свядомасці;

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



– даследаваць фактары складанасці і асаблівасці правядзення структурнай рэарганізацыі, адраджэння і развіцця РКК у Беларусі на мяжы стагоддзяў;

– раскрыць адметнасць дзейнасці Касцёла на шляху да сацыяльнай справядлівасці, дэмакратызацыі грамадства, паказаць яго месца ў сістэме "Грамадства – Касцёл – Дзяржава";

– на фоне працэса нацыянальна-культурнага адраджэння даследаваць моўную палітыку і практыку ў гэтай справе Рымска-Каталіцкага Касцёла;

– асвятліць формы душпастырскай і культурна-асветніцкай дзейнасці Рымска-Каталіцкай канфесіі, скіраваных на падняцце духоўнасці людзей, адраджэнне лепшых духоўных традыцый Беларусі;

– паказаць рэлігійную талерантнасць каталікоў як фактар духоўнай кансалідацыі грамадства Беларусі на мяжы стагоддзяў, месца і ролю РКК сярод іншых хрысціянскіх канфесій.

***Аб'ект і прадмет даследавання.*** Аб'ектам даследавання з'яўляецца дзейнасць Рымска-Каталіцкага Касцёла ў Беларусі ў сярэдзіне 1980-х гадоў XX ст. – 2000 год. **Прадметам даследавання** выступаюць праблемы царкоўнага будаўніцтва, асветніцкай, рэлігійна-нацыянальнай і дабрачыннай дзейнасці РКК у кантэксце культурна-гістарычнага працэсу.

***Храналагічныя межы даследавання*** ахопліваюць перыяд з сярэдзіны 80-х гадоў XX стагоддзя да 2000 г. Выбар верхняй мяжы абумоўлены неабходнасцю паказаць становішча Рымска-Каталіцкай канфесіі ў Беларусі ў сярэдзіне 80-х гадоў, магчымасці і передумовы яе адраджэння. Выбар ніжняй мяжы прыпадае на 2000 г., год заканчэння чарговага тысячагоддзя і стагоддзя. Гэты перыяд характарызуецца новымі рэаліямі каталіцкага і канфесійнага жыцця, якія садзейнічалі разгортванню актыўнай дзейнасці Касцёла ў Беларусі па маральнаму адраджэнню грамадства, змяншэнню праяў бездухоўнасці, бязвер'я.

***Метадалогія і метады даследавання.*** Метадалагічнай асновай даследавання паслужылі прынцыпы гістарызму, навуковай аб'етыўнасці. Дысертант імкнуўся пазбегнуць палітызаванай інтэрпрытацыі фактаў і суб'ектыўнай ацэнкі мінулага. Пры рабоце над даследаваннем былі выкарыстаны такія метады гістарычнага пазнавання, як гісторыка-параўнальны, гісторыка-тыпалагічны, статыстычны і інш.

Навуковы пошук пры даследаванні дадзенай праблемы насіў комплексны характар. Верагоднасць атрыманых вынікаў забяспечвалася метадалагічнымі пазіцыямі дысертанта, усебаковым аналізам вывучэння фактаў, параўнаннем іх з іншымі фактамі і супараўнальнасцю вынікаў з раней вядомымі фактамі.

***Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў.*** Дысертацыя з'яўляецца першым у айчыннай гісторыяграфіі спецыяльным даследаваннем, прысвечаным адраджэнню і дзейнасці Рымска-Каталіцкай канфесіі ў Беларусі на мяжы тысячагоддзяў. У рабоце прапанавана новае канцэптуальнае асэнсаванне ролі каталіцызма ў дадзены перыяд. Абвяргаюцца стэрэатыпы поглядаў, якія склаліся ў выніку тэндэнцыйнага асвятлення РКК як антынароднай і рэакцыйнай.

На выснове аналіза архіўнага матэрыяла і вывучэння нешматлікіх апублікаваных работ закладзены новы накірунак у айчыннай гісторыяграфіі – даследаванне Рымска-Каталіцкага Касцёла, яго ўклад у духоўнае, культурнае развіццё беларускай нацыі на мяжы тысячагоддзяў. Вывучэнне гісторыі РКК у Беларусі з'яўляецца састаўной часткай

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



вывучэння гісторыі Беларусі. Без аналіза дзейнасці РКК, яго ролі ў гістарычным лёсе беларусаў, на думку дысертанта, не можа быць поўнай гісторыя Бацькаўшчыны. Раскрыты такія накірункі дзейнасці, як душпастырская, культурна-асветніцкая, гуманітарна-дабрачынная.

Для навуковага даследвання прапануецца шэраг раней невядомых крыніц з дзяржаўных архіваў і архіваў Мінска–Магілёўскай архідыяцэзіі, Пінскай і Гродзенскай дыяцэзіі. Пры гэтым пераадолена тэндэнцыйнасць і аднабаковасць у выбары крыніц, што раней зыходзіла з боку варожых каталіцызму колаў.

***Практычнае значнасць атрыманых вынікаў.*** Дысертацыя значна пашырае і паглыбляе гісторыю айчыннай духоўнай культуры на мяжы тысячагоддзяў, аналізуе роль Каталіцкага Касцёла ў культурным, духоўным, светапоглядным жыцці беларусаў. Фактычна новы матэрыял і высновы па тэме могуць паслужыць для падрыхтоўкі вучэбнай літаратуры і абагульняючых прац, стварэння курсаў лекцый па гісторыі Беларусі, рэлігіязнаўству, культуралогіі, паліталогіі. Матэрыялы дысертацыі знойдуць выкарыстанне пры рэканструкцыі канфесійных аспектаў гісторыі тых мясцін Беларусі, дзе распаўсюджаны каталіцызм, будуць садзейнічаць развіццю краязнаўства, напісанню кніг-хронік "Памяць". Аўтар прыняў асабісты ўдзел у напісанні такой работы, прысвечанай гісторыі Верхнядзвінскага раёна. Палажэнні, выкладзеныя ў рабоце, могуць быць запатрабаваны ў практычнай дзейнасці работнікаў дзяржаўных структур, якія займаюцца пытаннямі канфесійнага жыцця.

***Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону.***

1. Рымска-Каталіцкі Касцёл здаўна існуе ў Беларусі. Асаблівасцю яго дзейнасці ў даследуемы перыяд з'яўляецца аб'яднанасць у межах беларускай дзяржавы. Да ўз'яднання беларускіх зямель у 1939 г. Касцёл, як і краіна, быў падзелены на заходнюю і ўсходнюю часткі. Поруч з Праваслаўнай Царквой Касцёл актыўна стаіць на абароне хрысціянства, захоўвае лепшыя гістарычныя традыцыі беларускай зямлі. Праз сваю душпастырскую дзейнасць ён бароніць людзей ад бездухоўнасці, што ў сучасны перыяд набывае для Беларусі асаблівае значэнне.

2. У пераходныя перыяды, якія пагражаюць зломамі людскіх лёсаў, а такім з'яўляецца сучасны стан беларускага грамадства, хрысціянства дапамагае спасцігнуць сэнс жыцця, стварыць шкалу каштоўнасцей для кожнай канкрэтнай асобы, фарміраваць яе грамадскія і індывідуальныя ідэалы, светапогляд у цэлым. Рымска-Каталіцкі Касцёл у Беларусі ў постсавецкі перыяд накіроўваў намаганні на запаўненне духоўнага вакуума, што ўзнік у выніку спробы многіх людзей выйсці з атэістычнага палону, якія не ўмелі, а часам і не жадалі прыняць духоўныя, рэлігійныя ідэалы.

3. Адраджэнню РКК у Беларусі, якое датуецца апошнім дзесяцігоддзем XX стагоддзя, спрыялі не толькі новыя палітычныя ўмовы, што склаліся ў краіне, але і каталіцкія традыцыі, якія захаваліся ў грамадстве. Іх носьбітамі з'яўляліся старэйшыя практыкуючыя вернікі. Яны змаглі перадаць каталіцкую веру маладому пакаленню. Гэта сведчыць аб тым, што, стаўшы стэрэатыпным у савецкія гады, тэзіс аб няўхільным зніжэнні рэлігійнасці ў грамадстве не знайшоў пацвярджэння.

4. Актывізацыя каталіцкага жыцця садзейнічала падняццю аўтарытэта Касцёла Беларусі ў свеце. З 1989 г. нунцыем Апостальскай сталіцы выконваецца функцыя дыпламатычнага прадстаўніка дзяржавы Ватыкан. Вылучэнне перад усім светам Беларусі, як хрысціянскай краіны, выявілася і ў тым, што аднаму з беларускіх біскупаў – Казіміру Свёнтаку Папам Рымскім была нададзена высокая годнасць кардынала (ва ўсім

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



свеце кардыналаў усяго 120). Гэты факт стаў шырока вядомы ўсяму свету дзякуючы сродкам масавай інфармацыі, якія не маглі не расказаць і пра краіну Беларусь. Як акт прызнання заслуг Рымска-Каталіцкага Касцёла ў Беларусі сведчыць наданне Папам Рымскім тытулу базылік тром святыням – у Будславе, Гродне і Пінску.

5. Спецыфіка дзейнасці Рымска-Каталіцкай канфесіі абумоўлена многімі фактарамі, і ў першую чаргу поліканфесійнасцю беларускай зямлі, дзякуючы чаму каталіцтва, якое здаўна існуе ў Беларусі побач з іншымі канфесіямі, зазнала іх уплыў. Беларусь стала ўзорам міжканфесійнага дыялогу, прымірэння, узаемаразумення, як на ўзроўні пярвічнай ячэйкі грамадства – сям'і, дзе засталася практыка рэгістрацыі змешаных шлюбаў, так і на агульнагрaмадскім, дзяржаўным узроўні.

6. Суседства з каталіцкімі Польшчай, Літвой, часткова з Латвіяй і Украінай не прывялі да адказу ад беларускасці ў дзейнасці Каталіцкага Касцёла. Наадварот, 90-я гады XX стагоддзя вывелі на першы план праблему нацыянальна-культурнага адраджэння. Зварот да рэлігійна-нацыянальнай ідэі з'яўляецца заканамерным крокам, які выкліканы апостальскім патрабаваннем несці слова Божае на зразумелай народу мове, абараняць належнае кожнаму народу духоўнае і прыроднае права выбіраць свой шлях культурна-гістарычнага развіцця.

7. Моўная палітыка РКК вызначаецца ўжываннем двух моў – беларускай і польскай. Склалася так, што двухмоўе ў Касцёле дубліруе двухмоўе ў Рэспубліцы Беларусь, з той розніцай, што ў дзяржаве поруч з беларускай функцыяніруе руская мова. У некаторых месцах усходніх рэгіёнаў рэспублікі па просьбе вернікаў службы праводзяцца на рускай мове. На аснове рашэнняў II Ватыканскага Сабора аб далучэнні нацыянальных моў у набажэнствах пашыраецца ўжыванне беларускай мовы ў жыцці Касцёла, што спрыяе фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці вернікаў, патрыятычнаму самасцвярджэнню народа.

8. Асноўным накірункам дзейнасці РКК з'яўляецца душпастырская місія, задача якой – задавальненне рэлігійных патрэбаў і пашырэнне рэлігійнай свядомасці, з чым мае справу кожны святар у парафіі. У даследуемы перыяд у Беларусі душпастырства здзяйснялася праз сродкі масавай інфармацыі, евангелізацыю ў нядзельных школах, бальніцах. У сувязі са свецкім характарам навучання Божае слова не вывучалася ў агульнаадукацыйнай і вышэйшай школах. Таму, каб не адстаць ад сусветнага духоўна-хрысціянскага цывілізацыйнага развіцця, на павестку дня паўстала задача стварэння ў Мінску Беларускага каталіцкага універсітэта "САФІЯ".

***Асабісты ўклад суіскальніка.*** Увесь аб'ём даследаванняў па тэме выкананы самастойна. Дысертантам вывучаны, сістэматызаваны і прааналізаваны значны фактычны матэрыял, выяўлены ў архівах і бібліятэках Беларусі, Расіі, Польшчы, крытычна асэнсаваны працы айчынных і замежных даследчыкаў. На гэтай аснове прапанавана аўтарскае бачанне праблемы.

***Апрабацыя вынікаў дысертацыі.*** Асноўныя палажэнні і высновы дысертацыі апрабіраваны на 3 міжнародных навуковых канферэнцыях, калектыўнай манаграфіі "Канфесіі на Беларусі (канец XVIII–XXст.)", адной манаграфіі і трох брашурах.

***Апублікаванасць вынікаў.*** Вынікі даследвання выкладзены ў 11 публікацыях, у тым ліку 2 манаграфіях, 3 брашурах. Агульны аб'ём публікацый складае 45 старонак.

***Структура і аб'ём дысертацыі.*** Дысертацыя складаецца з агульнай характарыстыкі работы, 7 раздзелаў, заключэння і спіска выкарыстаных крыніц і

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



літаратуры колькасцю ў 90 найменняў. Агульны аб'ём дысертацыі складае 109 старонак, з іх бібліяграфія займае 5 старонак.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

У першым раздзеле ***"Гісторыяграфія і крыніцы даследавання"*** разглядаецца стан распрацоўкі праблемы і аналізуюцца крыніцы даследавання. Аўтар фактычна ішоў па гісторыяграфічнай цаліне, таму што ў савецкай навуковай літаратуры даследаванні па гісторыі рэлігіі, каталіцтва амаль не праводзіліся. Выказванне К. Маркса "рэлігія гэта опіум для народа"[1] супрацьпаставіла рэлігію і духавенства савецкай ідэалогіі, сутнасць якой, адносна рэлігіі, была адна: непрымірымая барацьба з "царкоўнікамі" і "клерыкаламі" ўсіх масцей. Тэарэтычная слабасць марксісцкай канцэпцыі рэлігіі заключаецца ў тым, што яе фактычная сутнасць зведзена да адмоўнай ролі. Марксізм зацікаўлена не аналізаваў гістарычную і культурную ролю рэлігіі, вытокі яе высокай духоўнасці, здольнасці кансалідаваць грамадства, выхоўваць пачуццё адказнасці і маральнага абавязка.

У рамках марксісцкага вучэння пытанне пераадолення рэлігійнага фенамена прадвырашалася мэтанакіраваным выкарыстаннем аб'ектыўных заканамернасцей і адсюль выводзілася фатальная непазбежнасць знікнення рэлігійных пачуццяў, адмірання рэлігіі ў недалёкай будучыні. Таму метадалагічна-тэарэтычнай асновай гістарычных даследаванняў з'яўляўся класавы падыход, які прыносіў у даследаванні залішнюю палітызаванасць, паказваў прыверажанцаў рэлігійнай ідэалогіі ворагамі савецкай улады. Згодна такой пазіцыі ў пасляваенны перыяд з'явіліся прапагандысцкія работы А. І. Залескага[2], аб'ектам увагі якіх з'яўляўся паказ рэакцыйнай сутнасці Каталіцкага Касцёла, агрэсіі Ватыкана супраць СССР і ўтварэнню дзяржаў сацыялістычнай арыентацыі.

З пачатку 60-х гадоў, калі ў грамадскую думку пачала ўкараняцца ідэя пабудовы камунізма, дзе не знаходзілася месца рэлігіі, крытыка каталіцызма ўзмацнілася. Прыкладам таму з'явілася калектыўная работа "Католицизм без маски"[3]. У ёй з артыкуламі выступілі вядомыя "спецыялісты" па Ватыкану масквічы М. Мчадлоў, М. Шэйнман, мінчане – акадэмік АН БССР У. Перцаў, кандыдаты гістарычных навук А. Залескі, М. Грынблат, Я. Мараш з Гродна і інш. Яны разглядалі каталіцызм як ідэалогію, "якая ўключала ў сябе ўсю рэакцыйнасць асноўных хрысціянскіх догмаў". Распаўсюджванне каталіцызма ў Беларусі, на іх думку, "адыграла глыбока рэакцыйную ролю ў развіцці беларускага народа і беларускай культуры"[4].

Фальсіфікацыю гісторыі каталіцызма, прадстаўленне каталіцкага духавенства як "шпіёнаў і наймітаў польскай і іншых замежных разведак" працягнуў зборнік "Документы обличают. Реакционная роль религии и церкви на территории Белоруссии"[5].

Ідэалагічнае наступства на каталіцызм узмацнілася ў сувязі з работай і рашэннямі II Ватыканскага Сабора (1963–1965 гг.), які падняў аўтарытэт Каталіцкага Касцёла ў

---

[1] Маркс К., Энгельс Ф. Соч. Изд. 2. Т. 1. М. 1955. С. 415.

[2] Залескі А. І. Рэакцыйная сутнасць Ватыкана і каталіцызма.—Мн., 1959; яго ж. У чым шкоднасць каталіцызму.—Мн., 1960. – 72 с.

[3] Католицизм без маски. Специальный выпуск.—Мн., 1960 – 348 с.

[4] Тамсама. с. 24, 124

[5] Документы обличают. Реакционная роль религии и церкви на территории Белоруссии.—Мн.: Беларусь, 1964.—270 с.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



Асноўныя палажэнні і вывады абгрунтаваны ў наступных апублікаваных работах:

**Кнігі і брашуры**

1. Дзянісаў У., Завальнюк У. Касцёл св. Сымона і св. Алены – Мінск: Беларускі навукова-даследчы цэнтр інфармацыі і маркетынгу АПК. 1996. – 52 с.
2. Канфесіі на Беларусі (канец XVIII – XX ст.) / В.В. Грыгор'ева, У.М. Завальнюк, У.І. Навіцкі. А.М. Філатава; навук. рэд. У.І. Навіцкі. Мінск: ВП "Экаперспектыва", 1998. – 340 с. (С. 293-338)
3. Завальнюк В. История Будславской базилики. Минск: Костел св. Сымона и св. Елены. 1998. – 111 с.
4. Завальнюк У. Узняліся крыжы над святынямі. – Мінск: Касцёл св. Сымона і св. Алены. 1999. – 201 с.
5. Завальнюк У., Навіцкі У. Рэлігійнае жыццё ў 20 – 30-я гады // Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Верхнядзвінскага раёна. У 2-х кн. Кн. 1-я. - Мінск: Паліграфафармленне, 1999. 120-125 с.

**Артыкулы ў часопісах, матэрыялах канферэнцый**

6. Zawalniuk W. Czerwonym kościele w Mińsku. // Lihtuania. Kwartalnik poświecony problemom Europy Środkowo-Wschodniej.- Warszawa, 1998, nr.4 (29).
7. Завальнюк У., Навіцкі У. Рэпрэсіі духавенства рымска-каталіцкай царквы ў БССР (20 – 30-я гг.) // Палітычныя рэпрэсіі на Беларусі ў XX ст. Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, 27 – 28 сакавіка 1998 г.) Мінск: 1999. С. 122 – 130.
8. Завальнюк У. Радыёперадача "Голас душы" і яе ўплыў на духоўна-экуменічнае адраджэнне народа ў нашыя дні // Труды первого международного конгресса "Демографические проблемы Беларуси" 17 – 20 марта 1999 г. Минск, 1999. С.169 – 171.
9. Завальнюк У. Каталіцкі касцёл у Беларусі ў XX ст. // Беларускі гістарычны часопіс. – 2000. - №4. – С.37 – 43.
10. Завальнюк У. Значэнне радыёперадачы "Голас душы" ў аздараўленні і развіцці духоўнасці, маральнасці і нацыянальнай бяспекі беларускага народа // Материалы Республиканской научно-практической конференции "Роль социальных и трудовых отношений в решении демографических проблем народов на рубеже III-го тысячелетия" 23 – 24 ноября 2000 г. Мінск. С. 115—117.
11. Завальнюк У. Каталіцкі касцёл у Беларусі ў XX ст. // Спадчына. – 2000. - №4. – С.49 – 60.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



# РЭЗЮМЕ

Завальнюк Уладзіслаў Мацвеевіч

## АДРАДЖЭННЕ І ДЗЕЙНАСЦЬ РЫМСКА-КАТАЛІЦКАЙ КАНФЕСІІ Ў БЕЛАРУСІ (СЯРЭДЗІНА 1980- х – 2000 гг.)

***Ключавыя словы*** – хрысціянства, каталіцтва, праваслаўе, уніяцтва, ксёндз, пробашч, біскуп, Сінод, кардынал, нунцый, іерархія, касцёл, прыхажане, культурна-асветніцкая дзейнасць, душпастырства, хрысціянскія каштоўнасці, моўная палітыка, дабрачыннасць, міжканфесійныя адносіны, этнакультурная рэчаіснасць.

***Аб'ект даследавання*** – адраджэнне і дзейнасць Рымска-каталіцкага Касцёла ў Беларусі ў сярэдзіне 1980_х гадоў XX ст. – 2000 год. ***Прадметам даследавання*** выступаюць формы культурна-асветніцкай, рэлігійна-нацыянальнай, дабрачыннай дзейнасці РКК у разглядаемы перыяд.

***Мэта даследавання*** – паказаць складанасці і асаблівасці правядзення структурнай рэарганізацыі, адраджэння і развіцця рымска-каталіцкай канфесіі ў Беларусі на мяжы стагоддзяў, асвятліць формы душпастырскай, культурна-асветніцкай дзейнасці, скіраваных на падняцце духоўнасці, адраджэнне лепшых духоўных традыцый людзей. У аснову метадалагічнай базы пакладзены прынцып гістарызму, аб'ектыўнасці і каштоўнаснага падыходу ў гістарычным пазнанні. Выкарыстаны гісторыка-параўнальны, гісторыка-тыпалагічны, храналагічны, лагічны, статыстычны метады вывучэння мінулага.

***Навізна атрыманых вынікаў*** дысертацыі забяспечваецца ўвядзеннем у навуковае абарачэнне шырокага кола крыніц і творчым падыходам да даследаванняў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі. Упершыню вывучана праблема легітымізацыі Рымска-Каталіцкага Касцёла ў Беларусі, аднаўлення касцёльных структур і стварэння поўнай касцёльнай іерархіі, у тым ліку прадстаўніцтва Апостальскай Сталіцы-нунцыятуры. Раскрыты такія накірункі дзейнасці, як душпастырская, культурна-асветніцкая, гуманітарна-дабрачынная. Адвяргаюцца стэрэатыпы поглядаў, якія склаліся ў выніку тэндэнцыйнага асвятлення РКК як антынароднага і рэакцыйнага, прапанавана новае канцэптуальнае асэнсаванне ролі каталіцызма ў жыцці беларускага грамадства ў дадзены перыяд.

***Атрыманыя вынікі*** могуць быць выкарыстаны для правядзення далейшых даследаванняў па дадзенай праблеме, падрыхтоўцы лекцыйных курсаў, напісанню абагульняючых прац і вучэбнай літаратуры па канфесійнай гісторыі Беларусі.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



## РЕЗЮМЕ


Завальнюк Владислав Матвеевич

ВОЗРОЖДЕНИЕ И ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ РИМСКО-КАТОЛИЧЕСКОЙ КОНФЕССИИ В БЕЛАРУСИ (СЕРЕДИНА 1980-х – 2000 гг.)

***Ключевые слова*** – христианство, католичество, православие, униатство, ксендз, настоятель, епископ, Синод, кардинал, нунций, иерархия, костел, прихожане, культурно-просветительская деятельность, душпастырство, христианские ценности, языковая политика, благотворительность, межконфессиональные отношения, этнокультурная действительность.

***Объект исследования*** – возрождение и деятельность Римско-Католического Костела в Беларуси в середине 1980-х годов XX ст. – 2000 год. ***Предметом исследования*** выступают формы культурно-просветительской, религиозно-национальной, благотворительной деятельности РКК в рассматриваемый период.

***Цель исследования*** – раскрыть сложность и своеобразие проведения структурной реорганизации, возрождение и развитие римско-католической конфессии в Беларуси на рубеже столетий, осветить формы душпастырской, культурно-просветительной деятельности, направленных на повышение нравственности, возрождение лучших духовных традиций народа. В основу методологической базы положен принцип историзма, объективности и ценностного подхода в историческом познании. Использованы историко-сравнительный, историко-типологический, хронологический, логический, статистический методы изучения прошлого.

***Новизна полученных результатов*** диссертации обеспечивается введением в научный оборот широкого круга источников и творческим подходом к исследованию отечественной и иностранной историографий. Впервые изучена проблема легемитизации Римско-Католического Костёла в Беларуси, возрождение костельных структур и создания полной костельной иерархии, в том числе представительства Апостольской Столицы-нунциатуры. Раскрыты такие направления деятельности, как душпастырская, культурно-просветительная, гуманитарно-благотворительная. Опровергаются стереотипные взгляды, сложившиеся в результате тенденциозного освещения РКК как антинародного и реакционного, предложено новое концептуальное осознание роли католицизма в жизни белорусского общества в данный период.

***Полученные результаты*** могут быть использованы для проведения дальнейших исследований по данной проблеме, подготовке лекционных курсов, написанию обобщающих работ и учебной литературы по конфессиональной истории Беларуси.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ




## Summary

Zavalnuyk Vladislav Matsveevich

Rebirth and activity of Roman Catholic Church in Belarus (mid $1980^{th}$ – 2000)

***Key words*** – Christianity, Roman Catholic Church, Orthodox Church, Union Church, Catholic priest, Synod, Cardinal, Hierarchy, Catholic church, believers, cultural-educational activity, Christian values, language policy, charitable activity, interconfessional relations, ethnic-cultural reality.

***The object of the research*** is the rebirth and activity of Roman Catholic Church in Belarus in mid $1980^{th}$ – 2000. The subject of the research is the forms of cultural-educational, religious, national and charitable activity of Roman Catholic Church in this period.

***The purpose of the dissertation*** is showing the complexity and peculiarity of structural reorganization, rebirth and development of Roman Catholic Church at the edge of centuries, discussing of the process of Church cultural-educational activity forming. This activity was oriented on growth of humanity and rebirth of the best spiritual traditions in the society. The methodological basis of the dissertation is the historical principle, the principle of objectivity and value. There were also used the methods: the historical-comparative method of enquiry, the historical-typological method, the chronological method, the logical method and the statistical method.

***Scientific novelty of the results*** of the dissertation is in broad usage and creative interpretation of domestic and foreign works on this topic. First time in historical literature the problems of legitimization of Roman Catholic Church in Belarus, reestablishing of the church bodies and creating of the whole Catholic Hierarchy in the country were discussed. The author also covers such directions of the Church activity as pastoral, cultural-educational and humanitarian-charitable activities. The researcher also refutes the stereotypes that appeared in the society as the result of tendentious covering of Roman Catholic Church activity. The author proposed new conceptual understanding of the Catholic Church role in the life of Belarussian society in the examined period.

***The results of the dissertation*** can be used for further researches on this theme. They will also help in preparation of lecture courses and in writing books on confessional and general history of Belarus


